Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ЯК І НАВОШТА ПАСЫНКАВАЦЬ ПАМІДОРЫ?

У натуральным асяроддзі «пражывання» таматы — гэта шматгадовыя расліны. Першыя тры-чатыры месяцы яны нарошчваюць зялёную масу і каранёвую сістэму і толькі потым прыступаюць да цвіцення. У запасе ў іх доўгі цёплы перыяд, а на кожным парастку паступова вырастае завязь, таму пасынкаваць іх няма неабходнасці.

Ва ўмовах нашага кароткага лета дазволіць кусцікам памідораў такую раскошу мы проста не маем права — яны будуць пышныя, зялёныя, але, у найлепшым выпадку, ледзь паспеюць зацвісці да халадоў, а ўжо пра спелыя плады не варта і марыць. Таму ў ход ідзе фарміраванне куста з дапамогай пасынкавання і прышчыпвання.

Пасынкі — гэта парасткі-канкурэнты галоўнага сцябла, якія, як правіла, з'яўляюцца з пачаткам цвіцення і растуць з ліставых пазух. На іх таксама растуць лісты, з'яўляюцца кветкі, завязваюцца плады. Звычайна першыя пасынкі з'яўляюцца з першай кветкавай гронкай. Непасрэдна пад ёю развіваецца самы першы (і самы магутны) пасынак. Усе пасынкі, размешчаныя ніжэй за яго, адназначна падлягаюць выдаленню, асабліва гэта датычыцца таматаў адкрытага грунту.

Важна ведаць, з якімі менавіта сартамі таматаў — дэтэрмінантнымі або індэтэрмінантнымі — мы маем справу. Ад таго, да якой менавіта разнавіднасці належыць сорт, і залежыць неабходнасць наступнага пасынкавання.

Дэтэрмінантныя (і ў тым ліку штамбавыя) таматы спыняюць свой рост пасля пэўнай колькасці кветкавых гронак і аддаюць усе сілы на выспяванне пладоў. На такіх раслінах некаторыя пасынкі пакідаюць. Дэтэрмінантныя памідоры лепш фарміраваць у тры-чатыры сцяблы, а ў паўднёвых рэгіёнах можна не пасынкаваць наогул. Сярэднярослыя дэтэрмінантныя таматы (іх яшчэ называюць паўдэтэрмінантнымі) рэкамендуецца фарміраваць у два сцяблы,

гэта значыць, пакінуць неабходна толькі адзін самы лепшы пасынак, а ўсе астатнія выдаліць. Калі іх ну вельмі шкада абрываць, можна пакінуць яшчэ адзін у якасці трэцяга ствала — напрыклад, той, што ўтвараецца над другой кветкавай гронкай.

Індэтэрмінантныя таматы, якія растуць і працягваюць закладваць кветкавыя гронкі нават калі дасягнуты дах цяпліцы, звычайна фарміруюць у адзін ствол, тобок выдаляюць усе пасынкі без разбору. У крайнім выпадку (напрыклад, калі мала расады) можна пакінуць самы першы пасынак і пусціць яго другім ствалом.

Галоўнае правіла барацьбы з пасынкамі заключаецца ў тым, што рабіць гэта трэба своечасова, гэта значыць, не пазней, чым яны стануць большыя за 4-5 сантыметраў у даўжыню. У гэты момант яны яшчэ тонкія, не цягнуць сілы з матчынай расліны і іх лёгка выдаліць рукамі або з дапамогай нажніц.

Першае пасынкаванне праводзяць праз два тыдні пасля высадкі расады ў грунт, а затым паўтараюць рэгулярна, кожныя 10-14 дзён. Гэта дазваляе своечасова адсочваць пасынкі, якія нарастаюць, і прадухіляць загушчэнне куста.

Не выломлівайце іх цалкам, пакідайце «пянькі» вышынёй два сантыметры — у гэтым выпадку новыя парасткі на месцы старых не з'явяцца значна даўжэй.

Рэкамендуецца выдаляць пасынкі раніцай, пажадана ў сонечны дзень, каб зрэз або ранка на месцы абрыву за дзень паспелі зацягнуцца. Калі ўсё ж такі давялося пасынкаваць у пахмурнае надвор'е, для падстрахоўкі можна ўсе зрэзы (абрывы) прысыпаць попелам.

У першую чаргу абрывайце пасынкі на самых каштоўных і самых здаровых кустах. Сумнеўныя расліны (з пажоўклым або пабурэлым лісцем, напрыклад) пасынкуйце на наступны дзень. Такім чынам зніжаецца рызыка разнесці па цяпліцы магчымыя хваробы. Нярэдка бывае так, што на месцы выдаленага пасынка са спячай пупышкі ў пазусе ліста пачынае ўтварацца яшчэ адзін. Значыць, давядзецца паўторна выдаляць. Часам атожылкі пачынаюць расці ў ніжняй частцы расліны, калі ўжо даўно сфарміравалася некалькі гронак, — так бывае, калі тамат атрымлівае залішняе харчаванне. Таму пры выдаленні пасынкаў лепш аглядаць увесь куст цалкам. Часам яны растуць проста з кветкавай гронкі, з'яўляючыся нібы яе працягам. Такія пасынкі таксама трэба выдаляць, каб пазбегнуць затрымкі плоданашэння асноўнага ўраджаю.

Акрамя пасынкаў не забывайце абрываць у таматаў ніжняе лісце. Пад гронкай з буйнымі, але яшчэ зялёнымі памідорамі не павінна быць ніводнага ліста. Рэкамендуецца выдаляць па адзін-тры ніжнія лісты на тыдзень, у адваротным выпадку расліне гарантаваны моцны стрэс, што вядзе да затрымкі росту, а магчыма, і страты часткі ўраджаю. Лісты трэба выломліваць убок, а не ўніз, каб выпадкова не зняць са ствала кавалак скуркі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.42	21.44	17.02
Віцебск —	4.24	21.42	17.18
Магілёў —	4.32	21.35	17.03
Гомель —	4.38	21.22	16.44
Гродна —	4.59	21.58	16.59
Брэст —	5.09	21.49	16.40

Месяц

Першая квадра 28 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Васіля, Лявонція, Сяргея.*
К. *Галіны, Рэгіны, Марціна, Юльяна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

1 ЛІПЕНЯ

У краіне

1880 год — на ахвяраванні жыхароў Мінска было адкрыта рэальнае вучылішча, агульнаадукацыйная сярэдняя навучальная ўстанова. Утрымлівалася за кошт платы за навучанне і дапамогі з казны.

1885 год — рэальнае вучылішча заснавана ў Магілёве.

1910 год — у Віцебску з'явіўся настаўніцкі інстытут. У 1918-м пераўтвораны ў Віцебскі педагагічны інстытут. З 1995-га — Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава.

1925 год — нарадзілася Васіліса Паўлаўна Шыльнікоўская, заслужаны архітэктар Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Аўтар кнігі «Вялікі Усцюг».

1930 год — нарадзіўся Міхаіл Кірылавіч Балыкін, беларускі вучоны ў вобласці будаўнічай механікі, кандыдат тэхнічных навук, прафесар, заслужаны будаўнік Беларусі, заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі.

1940 год — нарадзіўся Уладзімір Рыгоравіч Барышэўскі, беларускі фізік-тэарэтык, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

1945 год — нарадзіўся Леанід Мікалаевіч Ківач, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар.

1990 год — заснаваны Чачэрскі гісторыка-этнаграфічны музей.

2000 год — Брэсцкі політэхнічны інстытут (заснаваны ў 1966-м як інжынерна-будаўнічы) пераўтвораны ў Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт.

У свеце

1875 год — пачаў дзейнасць Сусветны паштовы саюз.

1915 год — нарадзіўся Уілі Дыксан, амерыканскі блюзавы музыкант, які аказаў прыкметны ўплыў на развіццё рок-н-ролу.

1925 год — нарадзілася Клара Сцяпанаўна Лучко, расійская актрыса, народная артыстка СССР. З 1948-га служыла ў Тэатры-студыі кінаакцёра ў Маскве. Знялася больш чым у 50 фільмах, сярод якіх «Кубанскія казакі», «Вялікая сям'я», «Цыган», «Вяртанне Будулая» і іншыя. Лаўрэат Сталінскай прэміі.

1975 год — уступіла ў сілу Канвенцыя аб міжнародным гандлі відамі флоры і фаўны, якія знаходзяцца пад пагрозай знішчэння. Падпісаная ў 1973-м у Вашынгтоне.

Так гаварыў...

ВАЛЬТЭР:
«Шчасце — гэта толькі мара, а гора існуе рэальна».

УСМІХНЕМСЯ

— Каханы, давай я перафарбуюся ў бландзінку?
— Дарагая, але навошта ўзмацняць уражанне?

— А вы ведаеце, што падглядаць у замочную шчыліну непрыстойна?
— Ды што вы кажаце! А паказваць туды ўсякую гадасць прыстойна?

— Ну, як там, унучачка, маецца твой грэйпфрут?

— Бабуля! Колькі можна! Не грэйпфрут, а бойфрэнд! Бойфрэнд!

Старасць пачынаецца тады, калі на падтрыманне здароўя траціцца больш грошай, чым на яго разбурэнне.

У кожнай жанчыне павінна быць іскрынка. Толькі не замест мозга.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2229.
Нумар падпісаны ў 19.30 30 чэрвеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12